№№65–66
(3604–3605)
27 красавіка 2012 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах
Выдавец: УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Народная Воля

*На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...*

Якуб КОЛАС

У сувязі з чарговым святам — 1 Мая — наступны нумар «Народнай Волі» выйдзе не ў аўторак, а ў сераду, 2 мая.

Рэдакцыя.

26 гадоў таму адбылася чарнобыльская аварыя



Першы выбух на чацвёртым энергаблоку атамнай станцыі адбыўся 26 красавіка 1986 года ў 1 гадзіну 23 хвіліны. Затым адбыўся другі, узнік пажар. Аварыя на ЧАЭС стала самай буйной у гісторыі чалавецтва тэхнагеннай катастрофай.

Нягледзячы на тое што станцыя размешчана ва Украіне, каля горада Прыпяць, больш за 70% радыенуклідаў асела на тэрыторыі Беларусі. Ад наступстваў аварыі пацярпелі каля 2 млн жыхароў краіны, у тым ліку больш за паўмільёна дзяцей.

Паводле звестак Белстата, на пачатак 2012 года ў Беларусі ў зоне радыеактыўнага забруджвання знаходзілася 2 тыс. 394 населеныя пункты, у іх жыве 1 млн 141,7 тыс. чалавек (больш за 12% колькасці насельніцтва), у тым ліку 216,9 тыс. дзяцей.

З 1988 года прадстаўнікі апазіцыі штогод праводзяць у Мінску "Чарнобыльскі Шлях", прымеркаваны да гадавіны аварыі. Учора ў сталіцы таксама адбылася акцыя, санкцыянаваная гарадскімі ўладамі. Арганізатары "Чарнобыльскага Шляху" — прадстаўнікі грамадскасці і апазіцыйных партый — заяўлялі, што сёлета маюць намер правесці яго пад знакам патрабавання адмены будаўніцтва Астравецкай АЭС.

Падрабязнасці пра акцыю чытайце на нашым сайце **nv-online.info**.

ПАЛІТКУХНЯ

Канфлікт вычарпаны?

З цяплом у Беларусь пачалі вяртацца амбасадары краін Еўрапейскага Саюза, якія пакінулі Мінск пасля таго, як наша МЗС папрасіла прадстаўнікоў Польшчы і ЕС з'ехаць у свае сталіцы для кансультацый.

На знак салідарнасці ўсе краіны ЕС вырашылі адклікаць сваіх паслоў. Такім чынам, з 1 сакавіка ў Мінску не было ніводнага кіраўніка еўрапейскіх дыпмісій. І вось кансультацыі скончаны, першыя палітвязні на волі... Канфлікт вычарпаны?

Адным з першых вярнуўся амбасадар Швецыі Стэфан Эрыксан. У той жа дзень — пасол Польшчы Лешак Шарэпка. Услед за ім прыехалі прадстаўнікі Літвы, Венгрыі, Францыі, а таксама кіраўнік прадстаўніцтва ЕС Майра Мора. Менавіта пасля таго, як ёй і амбасадару Польшчы беларускімі ўладамі было рэкамендавана пакінуць тэрыторыю Беларусі, і адбыўся дэмарш паслоў на знак салідарнасці з калегамі.

Пакуль прадстаўнікі дыпламатычнага корпусу адмаўляюцца ад якіх-небудзь каментарыяў. Такое ўражанне, што яны ўсё яшчэ чагосьці чакаюць.

Тым часам адзін з былых палітвязняў — Зміцер Бандарэнка — так пракаментаваў апошнія падзеі: *"Калі прыезд еўрапейскіх паслоў будзе спрыяць вызваленню маіх зняволеных сяброў, якія ўсё яшчэ знаходзяцца за кратамі, то гэта добра. Калі не будзе спрыяць, то гэта кепска".*

Відавочна, што ў адносінах Беларусі і ЕС зараз надышоў нейкі пераломны момант. 23 красавіка на саміце кіраўнікоў знешнепалітычных ведамстваў краін аб'яднанай Еўропы ў Люксембургу было прынята рашэнне не пашыраць санкцыі супраць Беларусі. Але і не адмяняць. Аднак Еўрасаюз не змяніў сваю пазіцыю і адзінай умовай нармалізацыі стасункаў выстаўляе вызваленне ўсіх палітвязняў.

Любоў ЛУНЁВА.

Покровитель едет

Сегодня в Минск с официальным визитом должен прибыть президент Туркменистана Гурбангулы Бердымухамедов.

Визит планируется как двухдневный. Его программа пока не обнародована.

Напомним, что Александр Лукашенко трижды посещал Туркменистан — в 2002-м, 2008-м и 2011 годах. Гурбангулы Бердымухамедов был в Минске только однажды, в январе 2009 года.



Пару недель назад Беларусь посетила делегация Минстройархитектуры Туркменистана. Белорусские проектировщики и строители готовы принять участие в ряде проектов, самый крупный из которых — возведение промышленных зданий и сооружений в рамках контракта на строительство "под ключ" горно-обогатительного комбината на базе Гарлыкского месторождения калийных солей в Лебапском велаяте, где генподрядчиком выступает белорусское ОАО "Белгорхимпром". Кроме того, белорусской стороной подготовлен ряд архитектурных решений по объектам в Туркменистане. Это культурно-спортивный комплекс с гостиницей в Национальной туристической зоне "Аваза", "Восточный базар", комплекс жилых домов со спортивно-культурным центром "СКАТ" и другие.

В любом случае уже очевидно, что после смерти Туркменбаши Сапармурата Ниязова и смены в Ашхабаде официального лидера отношения между Туркменистаном и Беларусью сошли с отметки "ноль".

Кстати, президент Гурбангулы Бердымухамедов в своей стране имеет титул Аркадаг (Покровитель). Презентация титула прошла на параде, когда девушки в спортивных костюмах изобразили надпись "Аркадаг", а затем участники торжественного мероприятия хором исполнили песню "Алкыс сана, Аркадаг!" ("Благодарим тебя, о покровитель!"). Потом стало известно, что в Туркмении выведен новый сорт дыни, получивший название "Аркадаг", а также сорт арбуза под названием "Президент".

Предшественник Бердымухамедова, Сапармурат Ниязов, носил звания Туркменбаши (Отец туркмен) и Акбар Сердар (Великий Вождь). Период его правления именовался "Золотым веком". Время правления нынешнего президента получило название "Эпоха великого возрождения".

Елена НОВИКОВА.

САЛІДАРНАСЦЬ

Як дастукацца?

ААН не тая арганізацыя, якая спяшаецца ўмяшацца ў палітычныя спрэчкі, дзейнічаючы катэгарычна і рашуча. Але назіраючы за тым, што адбываецца ў Беларусі, і ААН не вытрымала.

Упраўленне ААН па правах чалавека заклікала беларускія ўлады прыступіць да працэсу дыялогу з апазіцыяй.

"Мы заклікаем урад Беларусі без усялякіх умоў вызваліць усіх тых, хто застаецца ў турме за мірны ўдзел у падзеях 19 снежня, а таксама іншых праваабаронцаў, такіх як Алесь Бяляцкі, і актывістаў апазіцыі, такіх як Сяргей Каваленка", — заявіў прэс-сакратар Упраўлення ААН па правах чалавека **Руперт Колвіл** на брыфінгу ў Жэневе.

Ён дадаў, што ААН заклікае ўлады Беларусі прыняць захады дзеля таго, каб праваабаронцы і журналісты маглі свабодна выконваць сваю працу, не асцерагаючыся запалохвання і ціску. Прэс-сакратар сказаў, што Упраўленне ААН па правах чалавека гатова аказаць дапамогу ўладам у справе забеспячэння грамадзянскіх і палітычных правоў народа Беларусі.

МЯЖА

Аб'язджайце «Варшаўскі мост»

27 і 28 красавіка выехаць з Беларусі праз пункт пропуску "Варшаўскі мост" на асабістым аўто будзе праблематычна.

Пра гэта паведаміў БелаПАН прэс-сакратар Дзяржаўнага пагранічнага камітэта **Аляксандр Цішчанка**. Справа ў тым, што на гэтыя дні паступілі заяўкі ад беларускіх і расійскіх турыстычных фірм на выезд больш як 100 аўтобусаў. У адпаведнасці з міжнароднымі дамоўленасцямі, яны павінны афармляцца на мяжы ў першую чаргу. Найбольш перагружаны пункт пропуску будзе з вечара 27 красавіка да 14.00—15.00 28 красавіка.

У сувязі з гэтым памежнікі рэкамендуюць аўтаўладальнікам скарыстацца для выезду ў Польшчу пунктамі пропуску "Пясчатка" і "Даманава".

ДОСЛОВНО

"В ближайшее время, может быть, ко Дню Независимости, мы освободим целый ряд осужденных, может, даже две-три тысячи, но тех, кто нормально себя там ведет и, как у них там говорят, встал на путь исправления".

Александр ЛУКАШЕНКО.

ПРАЦЯГ ТЭМЫ

Ці будуць судзіцца Дзмітрый Усс і Віктар Івашкевіч?

Экс-кандыдат на пасаду прэзідэнта Дзмітрый Усс дагэтуль не атрымаў позву ў суд Ленінскага раёна сталіцы па грамадзянскім іску майстра цэха прадпрыемства "Гродна Азот" Аляксея Емяльянчыка.

Пра тое, што прадстаўнік рабочых хоча праз суд спагнаць з палітыка 2 мільёны рублёў за заклікі да Еўрасаюза ўвесці эканамічныя санкцыі супраць беларускіх прадпрыемстваў і такім чынам "правучыць тых, хто заклікае да санкцый", паведаміў тэлеканал "Беларусь 1".

Але Дзмітрый Усс лічыць, што суда можа і не быць. "*Працягу гэтай тэмы няма. Быў толькі выклік у пракуратуру, дзе мне далі папярэджанне. Па-першае, улады не жадаюць, каб узгадваліся прозвішчы алігархаў, якіх яны самі стварылі і якія ім служаць. Ім не патрэбна, каб у судзе публічна гучала тэма "прыдворнага" бізнесу, а ціск Еўропы накіраваны менавіта на яго, а не на народ. Па-другое, думаю, што, можа, ніякага іску і не было. Той жа Емяльянчык мой зварот цалкам і не чытаў. Нават у пракуратуры я бачыў, што адну цытату вырвалі з кантэксту і вось толькі на яе падставе мне і далі папярэджанне. Калі ж зварот яшчэ раз прагучыць у судзе, то разумныя людзі мяне толькі падтрымаюць. Так што ўладам нявыгадна раскручваць гэтую тэму далей"*, — патлумачыў палітык.

Пакуль такая ж сітуацыя з судовай перспектывай і ў Віктара Івашкевіча, супраць якога работніца мазырскага "Нафтана" Марына Цыбліенка падала іск у суд Савецкага раёна Мінска. У праграме "Панорама" паведамлялася, што жанчына патрабуе ад палітыка 500 тысяч беларускіх рублёў для кампенсацыі маральных страт, якія ёй асабіста нанеслі выказванні Івашкевіча. Пакуль жа далей папярэджання ад пракуратуры справа не пайшла. Віктар Івашкевіч сам наведаў суд і пакінуў усе свае кантакты, каб разгляд справы не адбыўся ў яго адсутнасць.

Тым часам палітык вырашыў звярнуцца да старшыняў прафсаюзных арганізацый Наваполацкага і Мазырскага НПЗ, каб яму далі магчымасць асабіста адказаць на ўсе пытанні рабочых.

У сваіх заявах Віктар Івашкевіч напісаў, што з задавальненнем сустрэнецца з працоўнымі калектывамі і сярод іншых адкажа на пытанні:

— Хто вінаваты ў тым, што "ўзнікла рэальная пагроза ва ўжыванні эканамічных санкцый у дачыненні да Беларусі" і як іх можна пазбегнуць?

— Хто "вядзе антынародную палітыку, якая закранае не толькі работнікаў прамысловых прадпрыемстваў, але і настаўнікаў, урачоў, студэнтаў, пенсіянераў, іншых грамадзян, якім патрэбна сацыяльная дзяржаўная абарона"?

— Як "трэба папярэдзіць сітуацыю" і што неабходна зрабіць, каб не дапусціць санкцый?

— Хто вінаваты ў штомесячным росце цэн на гарачую ваду і электрычнасць, на мяса і малако, на паліва і праезд у грамадскім транспарце?

— У чыю кішэню ідуць мільярдныя крэдыты, расійскія датацыі і даходы ад гандлю з Еўропай, мільярды долараў ад распродажу нашых прадпрыемстваў расійскім алігархам і арабскаму бізнесу, а нашай зямлі — кітайскім каланістам?

— Чаму ад продажу "Белтрансгазу" і зніжэння цаны на расійскія газ і нафту для Беларусі заробкі ў нас не павялічыліся, а цэны не пайшлі ўніз?

Любоў ЛУНЁВА.

СМУТАК

Вяртанне ў Суботнікі

*У гэтыя велікодныя дні яшчэ адна светлая душа адляцела на неба. Душа **Галіны Яўхімаўны ПАЗЬНЯК,** маці найвыдатнага сына той Беларусі, якая імкнецца да Волі, Незалежнасці, Дабра — да сябе самой. Яго імя — Зянон Пазьняк — ведаюць усе. Але далёка не ўсе, хаця і многія, ведаюць пра тую, што дала Бацькаўшчыне такога сына і сама ўзнялася ўпоравень з ім.*

Яна адышла ў іншы свет 22 красавіка, не дажыўшы ўсяго некалькі дзён да свайго 90-годдзя (3 мая) і ў самы пярэдадзень дня народзінаў сына.

Пачуўшы скрушную вестку, спяшаюся ў знаёмы дом па вуліцы Герасіменкі. Даўнавата не была тут, заблыталася ў пад'ездах і кручуся без толку.

— Дык вось жа ён, трэці пад'езд, які вы шукаеце, — прыйшла на выручку старэнькая бабуля, абапёртая на кіёк. — Я тут па суседстве жыву, сюды часта прыходжу, дык і ведаю.

Дзякую сваёй збавіцельцы, пачынаю развітвацца. Яна затрымлівае мяне пытаннем:

— А скажыце, даражэнькая, што ж гэта сёння ідуць і ідуць у гэты пад'езд людзі, мо здарылася што? Вось і вы з цотнымі, на жалобу, кветкамі...

— Бяда здарылася, памерла адна цудоўная жанчына, — адказваю, не называючы імені нябожчыцы: ну хто ў гэтым гмаху пра каго ведае?

Бабулька раптам схамянулася, голас задрыжэў:

— А божачкі! Ці ж не Пазьнякова Ганна?! Вось яно як. А то хаджу і хаджу да гэтых прыступкаў, выглядаю, а яе няма. Раней раз-пораз выходзіла сюды, на сонейка, мы гаварылі, гаварылі і не маглі нагаварыцца. І душа неўпрыкмет адыходзіла, весялела.

— Дык вы ведалі Ганну Яўхімаўну? — на гэты раз схамянулася я. — Мо землякі з ёю?

— Вядома ж, землякі — з Беларусі. Толькі яна, казала, з Гродзеншчыны, а я — з Гомельшчыны, з-пад Веткі, мо чулі пра такое мястэчка? Нашу вёску Чарнобыль засыпаў, ніводнай хаты цяпер не засталося. Апынулася ў сталіцы, туга ж па роднай старонцы проста з'ядае. Нават дзеці — а яны, дзякуй Богу, добрыя, клапатлівыя — так мяне не разумеюць, як Ганна. Чулая да чужой бяды, бы сястрыца. Я ёй пра сваю вёску, яна — пра сваю. Распавядала, як там прыгожа — прыгажэй не бывае на свеце! Як сеяла бліз хаты авёс і жыта, каб штодня дзівіцца на цуды, што робіць зямля. Верыла, што яшчэ туды вернецца. Ніколі не жалілася, не плакала, не скардзілася ні на што, трымалася лепей за мяне. Хоць і старэйшая была, а не зламаная гадамі. Як жа я цяпер без яе? Кажаце там, на радзіме, яе і пахаваюць? Пухам ёй хай будзе родная зямелька.

Сцепаніда Восіпаўна, мая нечаканая субяседніца, ражком хусткі выцірала несціханыя слёзы. І не здагадвалася, што яе простая споведзь сталася, па сутнасці, першымі словамі, якімі развітвалася Беларусь з жанчынай, у поўнай меры ўвасобіўшай лёс сваёй Радзімы XX — пачатку XXI стагоддзяў. Лёс, сатканы з неверагодных выпрабаванняў і нязводных надзей, з незлічоных страт і зямных радасцяў, з перадолення тысячных бед у самых розных абліччах. Са стойкасці ў змаганні за сваю веру, уласную годнасць, будучыню свайго краю.

...Здавалася, усё гэта проста было напісана на яе нерухомым твары, калі ўбачыла яе ў труне. Яна нагадвала імклівую, лёгкую птушку, што толькі на імгненне запынілася ў палёце і зараз зноў узляціць, памкнецца разам з несмяротнай душой да самага дарагога, што было сэнсам яе існавання пры жыцці: да сына, які зараз далёка-далёка, і ў Суботнікі, пра якія яе Зянон сказаў: "Тое месца было Рай". Хаця рай пачынаўся з бясконцай мазольнай працы, цяжкага здабывання хлеба надзённага.

У паэме Зянона "Вялікае Княства" на гістарычным фоне Беларусі падаецца і гісторыя ягонага радаводу. Бацька Ганны Яўхімаўны вярнуўся з Першай сусветнай вайны і, не знайшоўшы шчасця ў пошуках надзейнага прытулку, вярнуўся ў Суботнікі. А ў хуткім часе — падзел Беларусі па Рыжскай дамове, польская ўлада і мянушка "бальшавік", парабкоўства ў пана Гана. Пасьба коней у багацеяў, надрыванне на лесавывазе, малазямелле, тытанічныя высілкі ў раскарчаванні няўдобіцы...

У дружнай сямейнай талацэ, у нялёгкіх сямейных турботах сталела дачушка Яўхіма — Ганна. Яны з братам Ясем і ўгаварылі бацьку, як разжыліся з добра ўробленай новай зямлі, не забыцца і пра "харашутку" — пасадзіць па берагах уздоўж Гаўі прыгожыя вербачкі. У гэтым раі і сустрэліся яны са Стасем (будучым бацькам Зянона) і хутка зразумелі, што прызначаны адно для аднаго. Праўда, час быў ужо трывожны: прыйшлі саветы, і бацьку Стася — вядомага дзеяча беларускага нацыянальнага руху, асветніка і выдаўца Яна Пазьняка — схапілі і расстралялі бальшавікі.

І таму Стась, вядомы блізкімі да бацькавых поглядамі, шукаў паратунак у вёсцы. Ды новая бяда — нашэсце фашысцкай армады. Згарэла дашчэнту Яўхімава сядзіба. Але браты і братавыя, аднавяскоўцы не кінулі сям'ю пад адкрытым небам. Талакой (мудры, высакародны беларускі звычай!) паставілі новую хату. То быў і для Ганны ўрок чалавечай дабрыні і спагады не толькі на словах. Бачыла і антыўрок — людскую жорсткасць і няўдзячнасць, калі былыя чырвонаармейцы, што жылі без турбот у іх хаце на ўсім гатовым, а потым падаліся ў лес, прыйшлі з пагрозамі і лаянкай гэтую самую хату рабаваць...

Але жыццё нікому не спыніць. Ганна са Стасем Пазьняком пабраліся. Ды па даносе аднаго мярзотніка немец страляў у мужа, а "свае" бандзюкі, ненавіснікі ўсяго беларускага, забівалі-тапілі яго як "камуніста-прапагандыста" са словамі: "А Купалу хто чытае і ўсім людзям падтыкае?" ды яшчэ "бальшавіцку нейку падлу, нейку Пушкіна зваядлу, беларускую дурыдлу?" (урывак з "Вялікага Княства"). Толькі смеласцю і кемнасцю ўратаваўся Стась...

І зноў гарыць зямля, шугае вёска — немцы з боем адыходзяць, падпальваючы ўсё на сваім шляху. Ледзь удалося Яўхіму хату ад агню адбіць. А калі ўжо чырвонаармейцы вялі палонных немцаў, тыя ж Ганна са сваёй маці Фэляй (вось дзе мяккасць і адыходлівасць мужнага сэрца беларускай жанчыны!) выбягалі на дарогу і кідалі няшчасным хлеб, як было і пры адступленні Чырвонай Арміі. І тады, і тады на жанчын крычалі канваіры, пагражалі застрэліць, а яны — сваё.

То гэта, сынку, усё бо людзі...
Ёсць справы,
што вяршацца ў небе.
І толькі той, хто веру мае,
Той мудрасць Боску адчыняе, —

з малаком маці спасцігаў гэтую мудрасць сын Ганны і Станіслава Зянон.

...Мінула шмат часу. Узгадваю, як аднойчы разам са знаёмымі Ганны Яўхімаўны прыйшла павіншаваць гаспадыню невялічкай, ужо самотнай кватэры з днём народзінаў. Калі госці разышліся, у пакоі, дзе паўсюль былі Зянонавы фатаграфіі, раскладзены яго кнігі (яна чытала іх штодня, зачытвала старонкі ледзь не да дзір), Ганна Яўхімаўна стала расказваць пра нараджэнне сына. Было 24 красавіка 1944 года. Чырвоная Армія наступала, паблізу вёскі грукатаў гарачы бой. У небе — грымоты і маланкі, на зямлі — трэск блізкай кулямётнай страляніны. У любым месцы можа гахнуць, накаціцца пагібель. А ў яе ўлонні просіцца на свет новае жыццё! У будынку касцёла ўдалося знайсці сховішча. А вёска палала. Дзед адзін збіваў агонь з хаты. Ганна пачула першы крык свайго дзіцяці, яшчэ не ведаючы, ці застануцца яны жывыя, ці вернуцца ў дом.



Ля роднага дома падчас наведвання Суботнікаў (пачатак 2000-х гадоў) Ганна Яўхімаўна пачувалася шчаслівай...

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Народная Воля http://www.nv-online.info 27 КРАСАВІКА 2012 г.

ПАСЛЯЧАРНОБЫЛЛЕ

Выратаванне «Надзеяй»...

Чарнобыльская катастрофа — трагічная старонка не толькі ў гісторыі Беларусі, Украіны ды Расіі, але і ўсяе цывілізацыі. І ўсё ж асноўнае пекла прыпала на Беларусь: каля 70% усіх радыеактыўных выкідаў асела на нашай зямлі...

Дасталося найперш тым, хто жыў паблізу станцыі — у так званай "зоне адсялення", у сумежных раёнах, асабліва дзецям... Першымі ўсвядомілі каласальную небяспеку для жыцця і здароўя нашых дзяцей... еўрапейцы. Разумеючы доўгатэрміновасць і глабальны характар наступстваў Чарнобыля, яны і падалі ідэю стварыць Цэнтр для аказання дапамогі дзецям, якія пацярпелі ад катастрофы. Для ажыццяўлення гэтай задумкі 28 ліпеня 1992 года было заснавана Беларуска-германскае сумеснае дабрачыннае прадпрыемства "Надзея — ХХІ век". Сёлета спаўняецца 20 гадоў, як былі падпісаны статутныя дакументы. Што атрымалася ў выніку? Наколькі своечасовым, жыццядайным і эфектыўным аказаўся праект, народжаны людской салідарнасцю? Ці запатрабаваны ён сёння і ці мае перспектыву на будучае?..

"А вы ўдумайцеся ў лічбы, звычайныя сухія лічбы, за якімі лёсы тысяч дзяцей, — гаворыць дырэктар Цэнтра **Вячаслаў Макушынскі**. — За два дзесяцігоддзі праз рэабілітацыйна-аздараўленчы цэнтр прайшлі **53 тысячы** маленькіх грамадзян. І справа нават не ў лічбах... Хіба жыццё, здароўе вымераеш нейкімі лічбамі?! Кожны лёс унікальны, бо жыццё і здароўе кожнага дзіцяці — самае каштоўнае, што можа быць на свеце...



— Усё пачыналася з суперажывання, з жадання дапамагчы малечы, якая апынулася закладнікам тэхнагеннай катастрофы. Чаму менавіта нямецкі бок першым і так актыўна ўключыўся ў дабрачынны праект, скіраваны на выратаванне, рэабілітацыю, аздараўленне нашых дзяцей?

— Верагодна, а на самай справе так і ёсць, людзей зварушыла не толькі зразумелае кожнаму нармальнаму чалавеку суперажыванне, але й імкненне, якое назвалі потым "прымірэнчым працэсам". Размова ідзе пра балючае мінулае, звязанае з Другой сусветнай вайной... Тут не варта тлумачыць, што нарабіла вайна на нашай зямлі. І хто быў акупантам — таксама вядома ўсім... Але прайшлі дзесяцігоддзі, у Германіі вырасла новае пакаленне людзей, краіна прынесла пакаянне... Усё гэта разам і падзвігла нямецкі бок дзейнічаць — у імя жыцця, а не войнаў, канфрантацый і недаверу. Простыя людзі з Нямеччыны ўспрынялі наш боль, як свой. Тут ніякага перабольшвання. Праект "Надзея — ХХІ век" — і канкрэтны, і сімвалічны адначасова. Людзі павінны прыходзіць на дапамогу адзін аднаму, незалежна ад таго, дзе і хто жыве, — гэта імператыў ХХІ стагоддзя...

— Цэнтр "Надзея" ўсе мінулыя гады развіваўся па ўзыходзячай… Цяпер гэта самадастатковае ці амаль самадастатковае прадпрыемства. У чым яго непаўторнасць, унікальнасць?

— Калі ўсё толькі пачыналася, нямецкі бок схіляўся да таго, каб будучы Цэнтр не проста знаходзіўся ў чыстым прыродным асяроддзі, але і сам быў ідэальна чыстым у экалагічным плане. Нам даводзілі, што важна, каб уся матэрыяльная база, уключаючы пабудовы, інжынерныя камунікацыі, энергетыку, тэхналогіі, былі экалагічна бяспечнымі. Спачатку — скажу шчыра — мы ўспрынялі ўсё не зусім адэкватна. Але потым зразумелі, усвядомілі — гэта і ёсць стратэгічная мэта. Цяпер у любым месцы Цэнтра вы не знойдзеце нават куточка, які б не адпавядаў такому падыходу. Па-першае... Доўга шукалі месца, дзе б маглі заснаваць наш Цэнтр, — знайшлі паблізу Вілейскага вадасховішча, у прыгожай лясістай мясціне. Некалі тут была біялагічная база Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Выкупілі яе і пачалі рэканструяваць, канечне, пад наглядам нямецкіх спецыялістаў, цалкам вытрымліваючы экалагічныя параметры. Ведаеце, унікальнасць ужо ў тым, што натуральны фон у нас не перавышае 4,6 мікрарэнтгена ў гадзіну.



Для параўнання: у Мінску такі фон на мяжы 20—22 мікрарэнтген. Далей... Сістэмы пажаратушэння, водаадлівы, цеплавога і энергетычнага забеспячэння, не кажучы ўжо пра мэблю, жыллё, вучэбныя пакоі, медыцынскія кабінеты і ўсё астатняе, абсалютна экалагічна бяспечныя.

— Як прасоўваюцца справы ў дачыненні самой рэабілітацыі і аздараўлення дзяцей зараз? Хто і адкуль сюды прыязджае на аздараўленне?

— Як і раней, дзеці з забруджаных тэрыторый, дзе павышаны фон, дзе прадукты харчавання — з прысядзібных участкаў, дары лесу, садавіна — усё яшчэ ўтрымліваюць непажаданыя рэчывы. Мы прымаем дзяцей у складзе арганізаваных груп — цэлыя класы, школкі... За адну змену — 24 каляндарныя дні — тут адпачываюць, вучацца, набіраюцца здароўя 280 чалавек. За год — чатырнаццаць з паловаю тысяч...

— Вядома, што да 85 працэнтаў радыенуклідаў паступаюць у арганізм дзіцяці з прадуктамі харчавання. Ці магчыма вывесці гэтыя радыенукліды за няпоўны месяц?

— Якасць прадуктаў харчавання ў нашым Цэнтры — архіважны прыярытэт. І тут, зноў жа дзякуючы нашым нямецкім сябрам, мы ў 2001 годзе стварылі (паралельна ўжо з цэнтрам "Надзея — ХХІ век") яшчэ адну структуру — "Надзея-плюс"... Дзеля чаго? А дзеля вытворчасці экалагічна чыстых прадуктаў для сваіх мэт. Я не ведаю ў Беларусі ніводнай іншай арганізацыі, дзе б землябробства цалкам вытрымлівала высокія экалагічныя стандарты. Ніякіх пестыцыдаў, ніякіх хімічных угнаенняў... Цяпер маем 23 гектары зямлі. Ёсці і свая цяплічная гаспадарка, і свой палявы гароднінны севаабарот, і свая пчалярня, і свой сад. Калі зусім коратка, то сёння цэнтр забяспечвае свае патрэбы ў прадуктах харчавання — ідэальна чыстых ад радыенуклідаў, рознай хіміі — на 96—98 працэнтаў. Канечне, такое харчаванне — разам з медыцынскімі працэдурамі — садзейнічае поўнаму вывядзенню радыенуклідаў з арганізма. Гэта пацверджана медыкамі. Але наш клопат не толькі якаснае, здаровае харчаванне. Усё павінна быць у комплексе. Задача ў тым, каб прывучыць дзятву правільна ставіцца да ўласнага здароўя — на працягу ўсяго жыцця, якое ў іх толькі пачынаецца..."

— Даводзілася чуць, што ваш цэнтр "Надзея — ХХІ век" — ледзь не ўзор па энергазберажэнні. Наколькі праўдзівая інфармацыя?..

— Толькі пару лічбаў: удзельны расход электраэнергіі за мінулыя два гады паменшыўся на 13,8% і склаў 5 кВтг на чалавека ў суткі. Удзельны расход цеплавой энергіі (паліва) за 2005—2010 гады паменеў на 32,8% — да 3,7 кг умоўнага паліва на чалавека ў суткі. Адкуль такі вынік?

Мы ажыццяўляем цэлы шэраг практычных мерапрыемстваў, скіраваных на эканомію энергіі. Канечне, дапамога нямецкіх сяброў зноў-такі неацэнная... Прыкладам, мы напоўніцу выкарыстоўваем сонечную энергію для падагрэву вады (сонечныя калектары), таксама ўстанавілі хуткасныя воданагравальнікі, перайшлі з электрычнага падагрэву вады на цеплавы, устанавілі тэрмарэгулятары на прыборах ацяплення, якія рэагуюць на тэмпературу паветра звонку, і г.д. Пералічваць можна бясконца. Па вялікім рахунку, калі мець на ўвазе доўгатэрміновую перспектыву, мы павінны стаць самадастатковымі на ўсе 100 працэнтаў. У фінансава-эканамічным плане, зразумела... І зараз усё для гэтага робіцца. Але гэта тэма асобнай гаворкі...

Георгій ЧЫГІР.
Фота аўтара.

Чый прагноз спраўдзіцца — беларускага ўрада ці Міжнароднага валютнага фонду?

Міжнародны валютны фонд прагназуе, што інфляцыя ў Беларусі сёлета складзе 38 працэнтаў. Пры гэтым рост эканомікі — толькі 3 працэнты.

Такія даныя прыведзены ў апублікаваным на мінулым тыдні аглядзе сусветнай эканомікі (World Economic Outlook). І значна разыходзяцца з прагнозамі на гэты год беларускага ўрада. Нагадаем, што, паводле прагнозаў Мінэканомікі, інфляцыя ў нашай краіне плануецца ў рамках 19—22%.

Сярод краін СНД, згаданых у прагнозе, Беларусь заняла першае месца па чаканым узроўні інфляцыі. Пасля нашай краіны ідуць Узбекістан (11%) і Таджыкістан (9%).

Інфляцыя ў суседніх Расіі ды Украіне сёлета, паводле прагнозу, складзе 6,2% і 7,9% адпаведна. У Польшчы ўзровень інфляцыі, на думку МВФ, не перавысіць 3,2%, у Латвіі і Літве — 2% і 3,3% адпаведна.

Найбольш блізкая да беларускай інфляцыя будзе ў Венесуэле. Там МВФ чакае ў 2012 годзе інфляцыю на ўзроўні 33,4%.

ЧУЛІ?

Заробкі павялічацца ў маі

1 мая зарплаты бюджэтнікаў узрастуць на 20%, а тарыфная стаўка першага разраду павысіцца на 5%, паведаміла днямі на прэс-канферэнцыі намеснік старшыні Мінгарвыканкама Жанна Бірыч.

Дарэчы, як паведамляе Нацыянальны статыстычны камітэт, у сакавіку налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў склала 3 млн 159 тыс. 624 рублі (у лютым 2012-га — 2 млн 964 тыс. 249 рублёў).

СТАТЫСТЫКА

Мінчане зарабляюць 500 долараў

Сярэдняя заработная плата ў Мінску ў сакавіку гэтага года перавысіла 4-мільённы рубеж, паведаміла карэспандэнту БЕЛТА прэс-сакратар Нацыянальнага статыстычнага камітэта **Алена Кандраценка**. У пераліку па сённяшнім курсе валют гэта складае праслаўвутыя 500 долараў.

Калі быць дакладнымі, то, па словах чыноўніцы, намінальна налічаная сярэдняя заработная плата ў сакавіку бягучага года дасягнула ў сталіцы 4 млн 103,9 тыс. рублёў.

Далей па ўзроўні сярэдняй зарплаты ідуць рэгіёны:

Мінская вобласць — 3 млн 139,8 тыс.рублёў,

Гомельская вобласць — 3 млн 51,1 тыс.,

Магілёўская — 2 млн 866,6 тыс.,

Віцебская — 2 млн 842,9 тыс.,

Гродзенская — 2 млн 819,1 тыс.,

Брэсцкая вобласць — 2 млн 734,3 тысячы рублёў.

АФІЦЫЙНА

"Але ў нас сёння і цэны ніжэй у пяць разоў, чым у Маскве. Гэта таксама трэба ўлічваць. Таму той, хто хоча сербануць дабра на чужыне, — хай едуць, мы не перашкаджаем".

(З выказвання А.Лукашэнкі падчас гутаркі з журналістамі пасля Рэспубліканскага суботніка 21 красавіка.)

ПАРАЎНАЕМ

Сапраўды, як адрозніваюцца кошты на прадукты ў Беларусі і Расіі? Паколькі Аляксандр Лукашэнка ўзгадаў Маскву, то і мы вырашылі параўнаць цэннікі ў маскоўскіх і мінскіх крамах. Выбралі вялікія ўніверсальныя магазіны: маскоўскі "Ашан" і мінскі BIGZZ, кошты для зручнасці прывялі да адной грашовай адзінкі — беларускага рубля. Вось што атрымалася:

Прадукты	"Ашан"(Масква)	BIGZZ (Мінск)
Мука выш.гатунку (1 кг)	6000	3500—4150
Малако 3,2%	10.670	4.850—7.250
Яйкі (1 дзяс.)	10.360	11.950
Бульба (1 кг)	5500	1800
Бульба ўраджаю 2012 г. (1 кг)	9000	9600
Капуста ўраджаю 2012 г. (1кг)	6500	11.100
Яблыкі (джанаголд) (1 кг)	16.850	15.150
Цукар (1 кг)	7830	7500
Мяса (ялавічына, 1 кг)	136.580	93.400
Кур.сцягно ахаладжанае (1 кг)	50.200	30.000
Рыба (фарэль, стэйк, 1 кг)	108.120	128.950
Алей ("Алейна")	15.900	15.900

Сярэдняя зарплата па Маскве ў сакавіку 2012 года ў пераліку на беларускія рублі склала 11 млн 200 тыс., па Мінску — 4 млн 104 тысячы.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

СІТУАЦЫЯ

Палітзняволеныя: хто яны?

*Днямі на волю выйшлі Андрэй Саннікаў і Зміцер Бандарэнка, аднак Еўропа патрабуе вызвалення ўсіх палітзняволеных. Хто падпадае пад крытэрыі "палітычных", а хто не? Як гэта вызначыць? Аб гэтым разважае праваабаронца **Валянцін СТЭФАНОВІЧ.***

— Манапольнага права на складанне спісаў палітвязняў не павінна быць ні ў кога, але разам з тым трэба прафесійна падыходзіць да гэтай справы, — адзначае **Валянцін СТЭФАНОВІЧ**. — Асноўнае — пытанне прафесійнай ацэнкі і падмацавання сваіх высноў аналізам, канкрэтнымі фактамі. Я разумею, што палітычныя партыі і рухі могуць мець свой інтарэс у прызнанні асобы палітычным вязнем. Напрыклад, таму што ён іх сябра, яны не могуць яго кінуць і па іншых прычынах. Але праваабаронцы ў гэтай сітуацыі павінны займаць абсалютна незалежную пазіцыю, не прымаць нейкіх кан'юнктурных рашэнняў незалежна ад таго, ад каго яны зыходзяць. Мы мусім імкнуцца называць рэчы сваімі імёнамі. Прыклад — 19 снежня: ніхто не казаў, што людзі, якія білі шкло ў Доме ўрада, абсалютна невінаватыя, мы казалі пра тое, што крымінальная справа, узбуджаная па артыкуле аб масавых беспарадках, з'яўляецца абсалютна непрапарцыянальнай рэакцыяй улад, што ніякіх масавых беспарадкаў не было. Тое, што былі прыкметы іншых правапарушэнняў, мы не адмаўлялі. Пра такія рэчы трэба казаць абсалютна бесстаронне. Што тычыцца розных поглядаў і меркаванняў, то яны і павінны быць, напэўна. А што тычыцца незарэгістраванага праваабарончага цэнтра "Вясна", то тут не складаюцца "афіцыйныя" спісы палітвязняў, як гэта падавалася асобнымі аўтарамі ў СМІ. Гэта спісы тых, каго прызнае палітвязнямі "Вясна". Мы ўзгадняем сваю пазіцыю і з іншымі праваабарончымі арганізацыямі. І калі ў спісе на сайце "Вясны" "клікнуць" на прозвішча палітвязня, то можна прачытаць кароткі аналітычны агляд яго справы, дзе тлумачыцца, чаму робіцца выснова пра палітычны кантэкст яго справы. Але наша меркаванне часам не супадае з меркаваннямі палітычных суб'ектаў.

— Як прыклад такіх несупадзенняў можна прывесці першую судзімасць сённяшняга палітвязня, ваўкавыскага прадпрымальніка Мікалая Аўтуховіча…

— Так атрымалася і са справай Андрэя Бандарэнкі. Мы не прыйшлі да канчатковай высновы пра выключна палітычны яе характар, хоць і не выключалі гэтага. Там быў адзін нюанс, які ўносіў сумневы: быў бачны асабісты след у стасунках паміж ім і былым партнёрам па бізнесу, які пазней правяраў фірму Бандарэнкі ўжо як супрацоўнік дзяржаўнага органа. Пры такіх абставінах было складана зрабіць выснову, ці была справа звязана з палітычным пераследам (таму што ён балатаваўся на выбарах і незадоўга да гэтага ўступіў у АГП). Але я абсалютна не хачу сказаць, што Андрэй Бандарэнка быў асуджаны справядліва, што не было ніякіх парушэнняў. І тое, што ён быў апраўданы ў рэшце рэшт, сведчыць, што ён быў асуджаны незаконна. Аднак незаконнасць асуджэння таксама не з'яўляецца дэфініцыяй палітычнай справы.

— Ці можна сказаць, што нацыянальныя крытэрыі вызначэння "палітычных" спраў адсутнічаюць?

— Існуюць крытэрыі, выпрацаваныя аўтарытэтнымі міжнароднымі арганізацыямі — інстытутамі Савета Еўропы, "Міжнароднай амністыяй", Human Rights Watch. Беларускія праваабаронцы імі і кіруюцца. У шэрагу выпадкаў мы абсалютна спакойна і адразу можам кваліфікаваць справу як палітычна матываваную. Напрыклад, калі гэта звязана з рэалізацыяй чалавекам аднаго са сваіх грамадзянска-палітычных правоў і свабод — свабоды асацыяцый, свабоды сходаў, свабоды меркаванняў і г.д. Ці калі ёсць відавочны палітычны матыў — у дзеяннях асобы ці ў дзеяннях дзяржавы ў дачыненні да гэтай асобы. Але ёсць больш замаскіраваныя выпадкі палітычнага пераследу. І можа спрацаваць "эфект Жоўціса", як я называю. Гэта вядомая гісторыя, калі ў Казахстане праваабаронца здзейсніў рэальнае ДТЗ са смяротным зыходам, але стаўленне з боку ўлад было непрапарцыянальнае: фальсіфікаваліся матэрыялы крымінальнай справы, відавочны быў абвінаваўчы ўхіл і жаданне ўлады пасадзіць такім чынам Жоўціса ў турму. То бок, быў відавочна палітычны матыў. Дык вось, задача праваабаронцаў — гэты матыў убачыць і яго абгрунтаваць. Таму што без абгрунтавання, чаму мы менавіта гэты матыў лічым палітычным, вельмі цяжка вызначыць тую ці іншую справу як "палітычную". Ад палітычных зняволеных вельмі важна адмежаваць зняволеных па грамадска значных непалітычных справах, у якіх пры жаданні можна знайсці палітычны матыў улады. Як прыклад — "справа Кавалёва—Канавалава": пры жаданні тут таксама можна знайсці палітычны матыў улад. Але ці можам мы казаць, што гэта палітычная справа? Калі б яны, напрыклад, па сваёй волі заявілі, што здзейснілі тэракт у палітычных мэтах, яны былі б палітычнымі тэрарыстамі, і ў шырокім сэнсе іх можна было б назваць палітвязнямі, але — патрабаваць не іх вызвалення, а справядлівага суда з выкананнем усіх працэсуальных норм і, вядома, непрымянення смяротнага пакарання пры любых абставінах. Адным словам, асноўная складанасць для праваабаронцаў заключаецца не ў крытэрыях, а ў падыходах, трактаванні гэтых крытэрыяў. Зразумела, што кожная краіна спрабуе нейкім чынам пры гэтых падыходах адлюстраваць тыя нюансы, якія ёсць у гэтай краіне. І, канешне, мы мусім прыйсці да ўніверсалізацыі крытэрыяў і вызначэнняў, але разумеем, што падыходы пры гэтым застануцца крыху адрозныя.

— Неяк вы адзначалі, што ў Беларусі, у прынцыпе, не так часта інкрымінуюць у палітычных мэтах гвалтоўныя дзеянні.

— Хоць такія выпадкі былі, але яны адрозніваліся тым, што (як нам падавалася) гэта асуджэнне па крымінальных справах, якія не мелі месца. Той жа Сяргей Парсюкевіч, якога абвінавачвалі ў гвалтоўных дзеяннях у дачыненні да супрацоўнікаў міліцыі, калі ён знаходзіўся ў ЦІПе. Але абставіны самой справы сведчаць пра тое, што ахвярай ужывання незаконнай фізічнай сілы стаў якраз сам Парсюкевіч, яго збілі супрацоўнікі міліцыі ў ізаляванай камеры. Калі па "справе 14-ці" людзей асудзілі за ўдзел у групавых дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак, Андрэя Кіма паралельна абвінавацілі ў гвалтоўных дзеяннях супраць супрацоўнікаў міліцыі. Аднак падчас суда ні адзін з відэаматэрыялаў не засведчыў, што Кім нанёс удар супрацоўніку міліцыі. Усё трымалася выключна на паказаннях міліцыі, і пры такіх абставінах мы лічылі, што віна Кіма не даказана, не ўстаноўлена судом. А ў асноўным палітвязні якраз ажыццяўлялі нейкае сваё права — без ужывання гвалту. Той жа Сяргей Каваленка абвінавачаны ў хуліганстве і пагрозе гвалтоўных дзеянняў у дачыненні да супрацоўнікаў міліцыі. Але калі глядзець сутнасць справы, то супрацоўнікі міліцыі, якія чакалі яго ўнізе, калі ён злез з ёлкі, пачалі яго там затрымліваць і біць пры гэтым. Відавочна, не Каваленка здзяйсняў пагрозу гвалту, а ўсё было наадварот.

— А што вы можаце сказаць пра справы спрэчных кандыдатаў на спіс палітзняволеных?

— Так, былі абвінавачанні, што праваабаронцы не сочаць за справамі Аляксандра Крутога, Юрыя Чыгілейчыка, Аляксандра Малчанава, якіх "адмовіліся ўзяць пад сваю апеку". Але гэта не так. Па-першае, без наяўнасці поўнай інфармацыі пра тую ці іншую справу сцвярджаць загадзя, скажам так, пра тое, што яна носіць палітычны характар, — я паўтаруся, гэта непрафесійны падыход. Па-другое, мы маем інфармацыю адносна ўсіх гэтых спраў, прычым з розных крыніц. Проста, я б сказаў, інфармацыя, якой мы валодаем, можа насіць непублічны характар. Ёсць няпісаны кодэкс — і я не буду агучваць інфармацыю, якая можа нашкодзіць найперш самім гэтым асобам, якія знаходзяцца ў зняволенні. Інфармацыю, якая можа насіць асабісты характар (напрыклад, пра стан здароўя кагосьці ці іншае), я лічу, публічна агучваць не патрэбна, але мы прымаем яе да ўвагі і ацэньваем пры прыняцці таго ці іншага рашэння.

Падрыхтаваў
Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ДА СЛОВА

Андрэс ХЕРКЕЛЬ, эстонскі палітык, дакладчык Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы (ПАСЕ) па Беларусі:

— Самая простая дэфініцыя палітычнага вязня — асоба, якая знаходзіцца ў турме з-за таго, што выступае супраць урада сваёй краіны. Не заўсёды проста вызначыць гэта, бо часта выкарыстоўваюцца непалітычныя артыкулы, можа мець месца селектыўнае правасуддзе ці нават відавочна штучныя абвінавачанні. Напрыклад, адзін з тыповых метадаў — "знайшлі" наркотыкі ў кішэні арыштаванага дысідэнта.

Вязні сумлення — людзі, пазбаўленыя волі з-за выказвання сваіх перакананняў. Аднак ёсць удакладненне, што гэтыя перакананні маюць быць мірнымі і не заклікаць да гвалту. Тыя, хто спрабуе звергнуць урад у супрацоўніцтве з разведкай іншай краіны, таксама не падпадаюць пад гэты статус.

Вяртанне ў Суботнікі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

А праз некалькі месяцаў, толькі-толькі стаўшы бацькам, Стась адыходзіў на фронт. Памаўчаўшы разам з жонкай над калыскай (якія ж тут можна знайсці словы і ці трэба шукаць?), ён ужо павярнуўся да дзвярэй, як...

— Хочаце верце, хочаце не, — казала Ганна Яўхімаўна, — але сынок-немаўлятка раптам працягнуў наўздагон бацьку сваю маленькую ручку, і з яго вуснаў я пачула гукі, што прагучалі ясна і выразна: "Тата"...

А журботны касцельны звон прарочыў, што яны не пабачацца ўжо ніколі...

Так, на бяду, і сталася. Станіслаў Пазьняк загінуў пад Кёнігсбергам незадоўга перад канцом вайны. А брат Ганны Ясь згарэў у танку напрыканцы 44-га.

Колькі ж ёй, маладой удавіцы, давялося перажыць, падымаючы сына, каб не проста апрануць-абуць і вывучыць, а і выгадаваць чалавекам, мужчынам, адказным не толькі за сябе. Ён змалку рос памочнікам і апорай сям'і, вучыўся ў маці і дзеда ўпартай сялянскай працавітасці, цярплівасці. Хлопчык рос — і кожны дзень чакаў бацьку з вайны. У доме панаваў культ бацькі. У сваёй унікальнай паэме "Вялікае Княства", прысвечанай *"дарагой маці"*, ён, ужо дарослым, так апісвае яе беспамылковыя педагагічныя прыёмы:

Калі я ўжо быў аж надта дрэнны,
Аргумант маці быў адзін:
"Твой бацька гэтак не рабіў".

А то без слоў жанчына даставала з шафы сямейную рэліквію — пашматаную куляй бацькаву "марнарку" (прадмет верхняй адзежы), клала навідавоку. І гэтага было дастаткова. Ні саладжавага сюсюкання, ні грубых крыкаў-натацый — толькі ўласны прыклад і вышыня духу, апора на сямейныя традыцыі бацькоў. І — бязмежная любоў, строгая і патрабавальная. Вось бы важным і ўганараваным акадэмікам ад педагогікі пераняць навуку выхавання ў гэтай, здавалася б, простай, але надзвычай мудрай сялянкі, з моцным характарам і святлістай душой, нязводнай прагай прыгожага. І такой самааддасцю, якую, на жаль, не часта сустракаеш. Праз гады і дзесяцігоддзі, з маладой вясновай пары і да глыбокай старасці — адзін нязгасны агонь у сэрцы: памяць пра мужа і пяшчота да сына. Пэўна, сказаць ім аб гэтым намагалася яна, калі некалькі год таму, наведаўшы Ганну Яўхімаўну ў бальнічнай палаце, убачыла яе, амаль нерухомую ў паўзабыцці пад кропельніцай. Яна ляжала з заплюшчанымі вачыма, нічога не казала, і толькі ціхі-ціхі шэпт вырываўся з яе грудзей: "Стась... Сынок... Стась... Сынок".

Дзякуй Богу, тады яна ачуняла.

Помню, як — зноў жа некалькі год таму — сустрэліся з ёю ў Курапатах. "Не-не, я зусім не стамілася, — гаварыла яна, узняўшыся на ўзгорак да "Галгофы". Хто ж калі чуў яе скаргі на нямогласць ці бачыў слёзы, хоць сілы былі ўжо даўно не багатырскія? Іншыя сілы вялі яе пакручастымі пуцявінамі лёсу. Старая жанчына ў цёмным паліто і хусціне моўчкі хадзіла між дрэў і крыжоў, і ніхто з тых, хто ішоў сюды з новымі крыжамі, свечкамі і кветкамі, не здагадваўся: гэта ж — маці таго, хто адкрыў усяму свету праўду пра гэтую дарогу смерці для тысяч і тысяч бязвінных ахвяр сталінскага тэрору. І без яе сына тут бы, на палітым крывёю куточку шматпакутнай беларускай зямлі, не паўстаў бы Народны мемарыял у памяць загубленых, засыпаных жвірам людскіх лёсах.

Праўда, не абышлося тут і без дасведчаных — усюдыісна дасведчаных па службовым абавязку — віжоў з відэакамерамі. Раз-пораз яны вытыркаліся з-за буданчыка на аўтобусным прыпынку насупраць урочышча, калі мы з сябрамі праводзілі Ганну Яўхімаўну да машыны...

Дарэчы, яна тады дзялілася неадольным жаданнем убачыць сыночка ("Я выцерплю, хай толькі робіць наканаваную яму справу") і свае Суботнікі. "Ну што вы, даражэнькая! — вохкалі мы. — Дарога ж няблізкая, здароўю можа зашкодзіць".

А яна ўсё роўна пабывала там! Угаварыла-такі блізкіх людзей звазіць туды, дзе для яе і яе сына — пачатак усяму. Зноў, шчаслівая хоць на міг, стаяла ля ганка роднага дома і зноў не магла наглядзецца на знаёмае наваколле. Можа, згадала вершаваныя радкі сына, ахопленага калісьці такім жа настроем і адчуваннем:

Калі я бачыў зноў
Гэты кветкавы луг
між сасновых бароў,
Мне захацелася ў ім растварыцца.

...Мноства людзей — знаёмых, малазнаёмых і зусім незнаёмых з ёю — прыйшлі праводзіць яе ў апошні шлях да Суботнікаў, дзе сабралася шмат землякоў, сваякоў Ганны Яўхімаўны (у дзявоцтве па прозвішчы Біль). Пасля адпявання ў мясцовым касцёле, у якім яна, глыбокая верніца, раней часта малілася, па дарозе на могілкі труну прывезлі і паставілі пасярод лужка перад іх домам. Гучалі апошнія развітальныя словы сяброў — і найдарожшы голас сына і яго жонкі Галіны, якія праз дальнюю далеч пасылаюць увесь свой боль і любоў сэрца Вялікай маці, шчыра дзякуюць усім, хто ў іх змушаную адсутнасць атуляў яе цяплом і клопатам да апошняга імгнення.

...Яна вярнулася ў сваю вёску, у любы край, што быў з ёй на яве і ў сне. І *"няхай душу тваю анёлы прымуць і знясуць яе ў нябёсныя вышыні..."* (з малітвы святара на развітанні з Ганнай Пазьняк).

Святлана КЛІМЕНЦЕНКА.

Вышэйшая адукацыя падаражэла амаль удвая

За год — з сакавіка 2011-га па сакавік 2012 года

— рост коштаў склаў 183,7%. Толькі за тры месяцы 2012 года кошт навучання ў ВНУ краіны падняўся на 30%. Пра гэта сведчаць даныя Нацыянальнага статыстычнага камітэта.

Не выключана, што ў самы бліжэйшы час вышэйшая адукацыя можа зноў падаражэць. Прычына — павышэнне стаўкі першага разраду з 1 мая, пра які ўжо заяўляюць чыноўнікі.

Такі рост коштаў на адукацыйныя паслугі — рэкордны для ўсёй Еўропы. Больш за тое, у некаторых еўрапейскіх краінах, наадварот, зніжаюцца адукацыйныя тарыфы. Напрыклад, у Германіі адбылося самае істотнае падзенне за апошнія гады — адукацыя там патаннела больш як на 5%.

Народная Воля http://www.nv-online.info
27 КРАСАВІКА 2012 г.

ГРОМКОЕ ДЕЛО

Анархия и беспредел

Власть говорит, что политзаключенных в нашей стране нет. Что все, кто сидит в тюрьмах, наказаны за обычные уголовные преступления. Тем не менее цивилизованный мир настойчиво требует от белорусских властей: "Освободите "политических", для Европы XXI века сажать людей в тюрьмы за политические взгляды — это позор!"

*Так все-таки есть в этих уголовных делах политика или нет? Сегодня "Народная Воля" рассказывает об уголовном деле, которое дало сразу три фамилии в список политзаключенных, — **Николай Дедок, Игорь Олиневич, Александр Францкевич.***

Операция «Поджигатели»

Эта история разразилась в разгар последней президентской кампании.

Вечером 30 августа 2010 года неизвестные бросили на территорию российского посольства в Минске две бутылки с зажигательной смесью. В результате инцидента никто не пострадал. Но одна бутылка попала в припаркованный на территории посольства автомобиль, он загорелся. Охрана посольства справилась с пожаром самостоятельно. Но история получилась удивительно громкая.

Александр Лукашенко выдвинул версию о российском следе. *"Атака одна, атака другая, третья в СМИ. Беспрецедентное давление в экономике. Не получается, надо искать другие методы. Поэтому это интересная версия, и мы будем ее отрабатывать. Скорее всего, этот инцидент нужен был им, чтобы показать — вот, видите, какой там Лукашенко, что якобы чуть ли не он сам устроил этот теракт, как они его называют, и поджег автомобиль".* Из слов правителя следовало, что правоохранительные органы тщательно отрабатывают версию о возможной причастности к пожару *"российских провокаторов".*

Однако уже 2 сентября на сайте белорусских анархистов было опубликовано заявление некой группы "Друзья свободы", в котором ответственность за инцидент у российского посольства они взяли на себя. Акция якобы стала протестом против задержаний активистов, вышедших на защиту Химкинского леса в Москве. Анархисты назвали это заявление провокацией, объявили, что никакие "Друзья свободы" им не известны, но маховик заработал...

Начиная с 3 сентября по всей стране, по данным правозащитников, было задержано более 50 человек. Задерживали тех, кто имел хоть какое-то отношение к анархистским группам политической и экологической направленности. Ноу-хау правоохранителей в этот раз стало применение процедуры "перезадержания". По нашему закону, человека можно задержать на трое суток, далее уже требуется обосновать и мотивировать арест. В этом случае действовали просто. По истечении трех суток человека не выпускали, а составляли новый протокол задержания. Так, Николая Дедка "перезадерживали" 7 раз, то есть 21 день он провел в изоляторе без предъявления обвинения. Остальных чаще всего "перезадерживали" по три раза — на 9 суток. Это подтверждает, что никаких оснований для задержания людей у правоохранителей не было. Дело "лепили" просто: кто что скажет, кто дрогнет, кто на кого покажет. Адвокаты по несколько дней не могли получить информацию о месте нахождения своих подзащитных, естественно, о предусмотренных законом встречах с защитниками наедине в таких условиях и речи не было.

28 ноября в Москве был схвачен Игорь Олиневич. На выходе из торгового центра на него просто набросились шесть человек без формы и каких-либо знаков отличия и увели с собой. Свидетелем произошедшего стал друг Игоря, иначе никто бы и не знал о произошедшем. Друзья Игоря разыскивали его в отделениях милиции и изоляторах Москвы, российские правоохранители отрицали наличие у них такого задержанного, а также причастность своих сотрудников к его аресту. А Олиневич тем временем нашелся в белорусском СИЗО КГБ. Его посадили в машину, заковали в наручники, натянули на лицо шапку и просто вывезли из российской столицы на автомобиле. Надо ли говорить, что такое "задержание", больше похожее на похищение, является нарушением всех мыслимых процедур? В том числе — процедур экстрадиции белорусских граждан из Российской Федерации.

В январе 2011 года министр внутренних дел Анатолий Кулешов доложил общественности, что следствием установлены все участники нападения на посольство. "Это пять граждан Республики Беларусь. Все молодые люди принадлежат к анархистскому движению", — сказал министр.

Без царя в голове

***Анархизм** ("ан" — "без", "архэ" — "власть") — политическая философия, которая исходит из того, что в системе, основанной на государственной власти и эксплуатации, люди не могут нормально жить и развиваться. Анархизм исходит из того, что общество может и должно быть организовано без государственного принуждения. При этом существует множество различных направлений анархизма.*

